# Змест


1 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5
2 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 16
3 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 27
4 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
5 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 63
6 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 81
7 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 90
8 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 102
9 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 118
10 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 133
11 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147
12 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 160
13 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 176
14 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 194
15 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 204
16 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 215
17 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 228
18 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 246
19 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 256
20 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 271
21 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 286
22 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 298
23 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 311
24 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 328
25 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 345
26 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 365
27 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 379
28 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 391
29 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 404
30 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 418
31 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 431
32 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 444
33 . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 460

Брама ў пекла. Пасляслоўе Тыльмана Вестфалена . . . 483

Каментары. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 494

Эрых Марыя Рэмарк нарадзіўся ў Аснабруку ў 1898 годзе, вучыўся ў каталіцкай настаўніцкай семінарыі. Быў прызваны ў салдаты ў 1916 годзе, пасля вайны спачатку працаваў пазаштатным настаўнікам, пазней — падменным рабочым і, нарэшце, рэдактарам у Гановеры, а з 1924 года — у Берліне. Рэмарк пакінуў Германію ў 1932 годзе і першапачаткова жыў у кантоне Тычына ў Швейцарыі. Яго кнігі «На Заходнім фронце без перамен» і «Дарога назад» былі спалены нацыстамі ў 1933 годзе, а ў 1938 годзе Рэмарк быў пазбаўлены нямецкага грамадзянства. З 1941 года ён афіцыйна жыў у ЗША і ў 1947 годзе атрымаў статус амерыканскага грамадзяніна. Рэмарк памёр у Тычыне, на сваёй другой радзіме, у 1970 годзе.

# 1

Жанчына ішла наўскос праз мост у бок Равіка. Ішла хутка, але неяк дзіўна, ледзь трымаючыся на нагах. Равік заўважыў яе толькі тады, калі яна апынулася амаль побач з ім. Ён убачыў бледны твар з высокімі скуламі і шырока пасаджанымі вачыма. Твар быў апалым, застылым, нібыта маска, а ў вачах у святле ліхтароў адбівалася такая шкляная пустэча, што Равік насцярожыўся.

Жанчына прайшла так блізка, што ледзь не зачапіла Равіка. Ён працягнуў руку і схапіў яе за локаць. У той жа момант яна пахіснулася і ўпала б, калі б ён яе не падтрымаў.

Равік не выпускаў яе рукі.

— Куды вы? — спытаў ён, крыху счакаўшы.

Жанчына няўцямна ўтаропілася ў яго.

— Адпусціце мяне, — прашаптала яна.

Равік нічога не сказаў. Ён па-ранейшаму сціскаў яе руку.

— Пусціце! Што гэта такое? — жанчына ледзь варушыла вуснамі.

У Равіка склалася ўражанне, што яна яго зусім не бачыць. Яна глядзела скрозь яго, кудысьці ў пустэчу ночы. Існавала толькі нейкая перашкода, якая затрымлівала яе і да якой яна звярталася.

— Адпусціце мяне!

Ён адразу ўбачыў, што яна не прастытутка. І не п'яная. Ён стаў трымаць яе крыху слабей. Калі б жанчына захацела, то лёгка змагла б вызваліцца, але яна гэтага нават не заўважыла. Равік яшчэ крыху пачакаў.

— Ну праўда, куды вы? Ноччу, адна, у Парыжы, ды ў такі час? — спакойна спытаў ён яшчэ раз і выпусціў яе руку.

Жанчына маўчала. Але і з месца не зрушылася. Нібыта раз спыніўшыся, яна больш не магла ісці далей.

Равік прыхіліўся да парапета моста. Ён адчуў пад пальцамі вільготны порысты камень.

— Ці не туды? — І ён кіўнуў за спіну, уніз, дзе Сена шэрым, плыткім ззяннем неспакойна накатвалася на цені моста Альма.

Жанчына не адказвала.

— Занадта рана, — сказаў Равік. — Занадта рана і занадта холадна. Лістапад жа.

Ён выцягнуў пачак цыгарэт і пакапаўся ў кішэнях у пошуках запалак. У вузкай кардонцы іх засталося толькі дзве, і ён абачліва нагнуўся, каб далонямі прыкрыць полымя ад лёгкага ветрыку, што веяў з ракі.

— Дайце і мне цыгарэту, — глухім голасам прамовіла жанчына.

Равік выпрастаўся і паказаў ёй пачак.

— Алжырскія. Чорны тытунь для салдат Замежнага легіёна. Для вас, мабыць, будуць замоцныя. А іншых у мяне з сабой няма.

Жанчына пакруціла галавой і ўзяла цыгарэту. Равік паднёс ёй агеньчык запалкі. Паліла жанчына спешна, глыбокімі зацяжкамі. Равік шпульнуў запалку праз парапет. Яна ляцела скрозь цемру маленькай znічкай і згасла, толькі дасягнуўшы вады.

На мост павольна ўз’ехала машына таксі. Шафёр спыніўся, зірнуў на іх і крыху пачакаў; потым даў газу і паехаў далей па мокрым, бліскуча-чорным бруку авеню Георга V.

Равік раптам адчуў, што стаміўся. Увесь дзень ён цяжка працаваў і не змог заснуць. Таму і выйшаў з дому зноў — каб выпіць. Але цяпер, у золкай прахалодзе глыбокай ночы, гэтая стома важкім мехам знячэўку ўпала яму на галаву.

Ён паглядзеў на жанчыну. Чаму ён яе наогул спыніў? З ёй штосьці здарылася, гэта зразумела. Але яму да гэтага што? Хіба мала ён бачыў жанчын, з якімі штосьці здарылася, асабліва ноччу, асабліва ў Парыжы. І цяпер яму было ўсё роўна, хацелася толькі аднаго — паспаць хоць пару гадзін.

— Ідзіце дахаты, — сказаў ён. — Што вам трэба на вуліцы ў такі час? А то ўкляпаецеся яшчэ ў непрыемнасці...

Ён падняў каўнер паліто, сабраўшыся пайсці. Жанчына паглядзела на яго, быццам нічога не зразумеўшы.

— Дахаты? — перапытала яна.

Равік паціснуў плячыма.

— Дахаты, у сваю кватэру, у гатэль — называйце як хочаце. Куды-небудзь. Вы ж не хочаце, каб вас паліцыя схапіла?

— У гатэль! Божухна! — усклікнула жанчына.

Равік застаўся на месцы. Вось ізноў некаму няма дзе прыткнуцца, падумаў ён. Можна было б і здагадацца. Кожны раз адно і тое. Ноччу яны не ведаюць, дзе падзецца, а раніцай знікаюць, перш чым прачнешся. Тады яны ведаюць, куды ісці. Адвечны танны начны адчай, які з цемрай прыходзіць і з ёю ж знікае. Равік кінуў недакурак. Хіба яму самому гэты адчай у косці не ўеўся?

— Хадземце вып'ем дзе-небудзь чарку шнапсу, — сказаў ён.

Так было прасцей за ўсё. Ён тады заплаціць і сыдзе, а яна сама разбярэцца, што рабіць.

Жанчына зрабіла няпэўны рух і спатыкнулася. Равік падхапіў яе за локаць.

— Стаміліся? — спытаў ён.

— Не ведаю. Здаецца, так.

— Настолькі, што не можаце спаць?

Яна кіўнула.

— Бывае. Хадземце. Я вас трымаю.

Яны пайшлі ўверх па авеню Марсо. Равік адчуваў, як жанчына абапіраецца на яго — так, быццам падае і мусіць за нешта трымацца.

Яны прайшлі па авеню Пятра I Сербскага. За скрыжаваннем з вуліцай Шаё вачам адкрываўся шырокі праспект, і ўдалечыні, на фоне дажджлівых нябёсаў, з'явіўся зыбкі і цёмны гмах Трыумфальнай аркі.

Равік паказаў на вузкі асветлены ўваход у сутарэнне.

— Сюды. Тут нешта ды знойдзецца.

Гэта быў шафёрскі шынок. Тут сядзела пара таксістаў і некалькі прастытутак. Кіроўцы гулялі ў карты. Прастытуткі пілі абсент. Яны змералі жанчыну шпаркім позіркам і абыякава адвярнуліся. Старэйшая з іх гучна пазяхнула, другая пачала ляніва падмалёўвацца. У глыбіні зала малодшы кельнер

з тварам незадаволенага пацука пасыпаў плітку апілкамі і пачаў падмятаць калідор. Равік выбраў для іх з жанчынай столік каля ўвахода. Так зручней: можна будзе хутчэй сысці. Паліто ён не зняў.

— Што будзеце піць? — спытаў ён.

— Не ведаю. Што-небудзь.

— Дзве чаркі кальвадосу, — сказаў Равік кельнеру ў камізэльцы і кашулі з закасанымі рукавамі. — І пачак «Чэстэрфільда».

— Гэтых няма, — адказаў кельнер. — Адны французскія.

— Ладна. Тады пачак «Ларан», зялёных.

— Зялёных таксама няма. Толькі сінія.

Равік разглядваў руку кельнера, дзе была наколата татуіроўка голай жанчыны, якая ішла па аблоках. Кельнер заўважыў ягоны позірк, сціснуў кулак і пайграў мускуламі. Наколатая жанчына распусна зарухала жыватом.

— Тады сінія, — сказаў Равік.

Кельнер выскаліў зубы.

— Можа, знойдзецца яшчэ пачак зялёных. — Ён пайшоў, гучна шоргаючы нагамі.

Равік глядзеў яму ўслед.

— Чырвоныя пантофлі, — адзначыў ён. — І жанчына з танцам жывата! Відаць, ён служыў у турэцкім флоце.

Жанчына паклала рукі на столік. Яна зрабіла гэта так, быццам больш ніколі не думала іх падняць. Рукі былі дагледжаныя, але гэта ні пра што не сведчыла. Зрэшты, не такія ўжо і дагледжаныя яны былі. Равік заўважыў, што пазногаць на сярэднім пальцы правай рукі зламаўся і яго, здаецца, адарвалі, а не падпілілі. У некаторых месцах аблупіўся лак.

Кельнер прынёс чаркі і цыгарэты.

— «Ларан», зялёныя. Знайшоў-такі яшчэ пачак.

— Я так і думаў. Вы служылі на флоце?

— Не. У цырку.

— Яшчэ лепш. — Равік працягнуў чарку жанчыне. — Вось, выпіце. У гэты час кальвадос — тое што трэба. Ці, можа, хочаце кавы?

— Не.

— Выпіце нагбом.

Жанчына кіўнула і асушыла чарку. Равік разглядваў яе. Ён бачыў патухлы твар, бляклы, амаль без ніякага выразу. Вусны поўныя, але бледныя, контуры быццам сцёртыя, і толькі валасы былі неймаверна прыгожыя, бліскучы натуральны блонд. На галаве яна насіла берэт, пад плашчом быў апрануты сіні касцюм, пашыты на замову ў добрага краўца. Толькі зялёны камень у пярсцёнку быў занадта вялікім, каб не быць падробкай.

— Хочаце яшчэ чарку?

Яна кіўнула.

Ён зрабіў знак кельнеру.

— Яшчэ два кальвадосы, але ў большыя чаркі.

— Большыя чаркі? І наліць больш?

— Так.

— Значыцца, два двайныя кальвадосы.

— Угадалі.

Равік вырашыў, што вып'е адным дыхам сваю чарку і сыдзе. Ён сумаваў і быў вельмі зморaны. Увогуле, ён цярпліва зносіў такія нечаканасці лёсу: меў за плячыма сорак гадоў зменлівага, неспакойнага жыцця. Але сітуацыі кшталту гэтай былі яму аж занадта добра вядомыя. Ён ужо некалькі гадоў жыў у Парыжы, па начах спаў мала, а блукаючы па горадзе, шмат на што нагледзеўся.

Кельнер прынёс замову. Равік узяў чарку яблычнай гарэлкі, духмянай і вострай на пах, і абярэжна паставіў яе перад жанчынай.

— Вось, выпіце. Дапамагае яно не надта, але хаця б саграває. І што б там у вас ні здарылася, не прымайце надта блізка да сэрца. Нямнога на свеце такога, аб чым варта доўга гараваць.

Жанчына паглядзела на яго. Яна не піла.

— Гэта праўда, — сказаў Равік. — Асабліва па начах. Ноч усё перабольшвае.

Жанчына працягвала глядзець на яго.

— Не трэба мяне суцяшаць, — прамовіла яна.

— Тым лепш.

Равік вачыма пашукаў кельнера. З яго хопіць. Ён ведаў такіх жанчын. Мабыць, руская, падумаў ён. Атабарацца

— Бо я стаміўся, — нецярпліва адазваўся Равік. — Бо цяпер ноч. Бо мы, калі хочаце, — толькі іскрынкі, якія гоніць кудысьці невядомы вецер. Едзьце далей.

— Гэта іншая справа. — Шафёр з нейкай пашанай дакрануўся да сваёй кепкі. — Гэта я разумею.

— Паслухайце, — сказаў Равік, у якога ўзнікла падазрэнне. — Вы рускі?

— Не. Але чытаю ўсякае рознае, пакуль чакаю кліентаў.

Не шчасціць мне сёння на рускіх, падумаў Равік. Ён адкінуў галаву назад. Вось бы зараз кавы, думаў ён далей. Вельмі гарачай чорнай кавы. Спадзяюся, у іх яе ўдосталь. Мае рукі павінны быць надзвычай спакойныя. Калі што пойдзе не так, прыйдзецца Вэбэру зрабіць мне ўкол. Але ўсё пойдзе як трэба.

Ён апусціў шыбу і павольна ды глыбока ўдыхнуў вільготнае паветра.

## 2

У маленькай аперацыйнай было светла як днём. Яна выглядала быццам бойня ў шпіталі: паўсюль стаялі вёдры з набрынялай крывёй ватай, россыпам валяліся перавязкі і тампоны, чырвань святочна кідалася ў вочы сярод мноства белі. Вэбэр сядзеў у перадпакоі за лакіраваным сталёвым сталом і нешта запісваў. Медсястра стэрылізавала ў кіпні інструменты. Вада булькатала, святло быццам шыпела, і толькі цела на стале ляжала цалкам безудзельна — яго гэта ўсё больш не хвалявала.

Равік ліНуў сабе на рукі вадкага мыла і пачаў іх церці. Ён мыў рукі з такой злоснай зацятасцю, нібы хацеў злупіць з іх скуру.

— Трасца! — прамармытаў ён сабе пад нос. — Сраная, дзяры яе ў калена, трасца!

Аперацыйная сястра з агідай зірнула на яго. Вэбэр падняў вочы.

— Спакойна, Эжэні! Усе хірургі лаюцца. Асабліва калі ўсё дрэнна скончылася. Маглі б ужо да гэтага і прывыкнуць.

Сястра кінула начынне, якое трымала ў руцэ, у кіпень.

— Прафесар Пэр’е ніколі не лаяўся, — абражана заявіла яна. — І тым не менш уратаваў мноства людзей.

— Прафесар Пэр’е спецыялізаваўся ў аперацыях на мозгу. Найтанчэйшая, дакладная механіка, Эжэні. А мы жываты растрыбушваем. Гэта іншае. — Вэбэр рэзка закрыў сшытак з запісамі і падняўся. — Вы выдатна папрацавалі, Равік. Але пасля халтуршчыкаў мала што можна зрабіць.

— І ўсё-ткі часам можна хоць нешта.

Равік выцер рукі і запаліў цыгарэту. Сястра з маўклівым дакорам расчыніла акно.

— Брава, Эжэні! — пахваліў Вэбэр. — Заўсёды дзейнічаеце згодна з прадпісаннямі.

— У мяне ў жыцці ёсць пэўныя абавязкі. І я не маю аніякай ахвоты ўзляцець у неба.

— Гэта добра, Эжэні. Вельмі супакойвае.

— А некаторыя ніякіх абавязкаў не маюць. І мець не хочуць.

— А гэта закід у ваш бок, Равік! — Вэбэр засмяяўся. — Лепш нам даць адсюль ходу. Раніцамі Эжэні вельмі агрэсіўная. Ды і рабіць нам тут больш няма чаго.

Равік павярнуўся. Ён паглядзеў на медсястру, якая мела пэўныя абавязкі. Яна без боязі пазірала на яго ў адказ. Акуляры ў нікелевай аправе надавалі яе пустому твару нейкую непарушнасць. Яна была такім жа чалавекам, як і ён, але любое дрэва здавалася яму больш блізкім, чым яна.

— Даруйце, — сказаў ён. — Ваша праўда.

На белым стале ляжала тое, што некалькі гадзін таму яшчэ было надзеяй, подыхам, болем і трапяткім жыццём. Цяпер гэта быў толькі бессэнсоўны труп, і чалавек-аўтамат, які зваўся сястрой Эжэні ды ганарыўся, што ніколі ў жыцці не дапускаў памылак, накрыў яго і вывез з аперацыйнай.

Такія ўсіх перажывуць, аж да сканчэння веку, думаў Равік. Святло не любіць гэтыя драўляныя душы, таму забывае пра іх і дае ім жыць доўга-доўга.

— Да пабачэння, Эжэні, — сказаў Вэбэр. — Выспіцеся сёння як след.

— Да пабачэння, доктар Вэбэр. Дзякуй, спадару доктару.

— Да пабачэння, — сказаў Равік. — Даруйце мне маю лаянку.

— І вам добрай раніцы, — жорстка праскрыгатала яна.

Вэбэр хмыкнуў.

— Сталёвы характар!

На дварэ была шэрая раніца. Смеццявозы грамыхалі па вуліцах. Вэбэр наставіў каўнер.

— Агіднае надвор'е! Вас падвезці, Равік?

— Не, дзякуй. Я хачу прайсціся.

— Такім надвор'ем? Магу вас падкінуць. Мне амаль па дарозе.

Равік пакруціў галавой.

— Дзякуй, Вэбэр.

Вэбэр дапытліва ўзіраўся ў яго.

— Дзіўна, што вы дагэтуль так хвалюецеся, калі хтосьці памірае пад вашым нажом. Вы ж у гэтай справе пятнаццаць гадоў, нагледзеліся ўжо.

— Але, нагледзеўся. І не хвалююся.

Вэбэр, мажны і нетаропкі, стаяў перад ім. Яго вялікі круглы твар свяціўся, бы нармандскі яблык. Чорныя падстрыжаныя вусы былі мокрымі і блішчэлі ад дажджу. На ўзбочыне стаяў «б'юік» і гэтаксама блішчэў. На ім Вэбэр зараз утульна паедзе дахаты — у свой ружовы лялечны дом у прадмесці, з чыстай, бліскучай жонкай і двума чыстымі, бліскучымі дзецьмі, — у сваё чыстае, бліскучае існаванне. І як яму патлумачыць гэтае задушлівае напружанне, калі нож робіць першы надрэз, калі за лёгкім націскам узнікае вузкі чырвоны, крывавы след, калі пад іголкамі ды скобамі цела рассцілаецца, быццам шматслойная завеса, калі на волю пазіраюць органы, якія ніколі не бачылі святла, калі ты, нібы паляўнічы ў джунглях, ідзеш па слядах і раптам сярод разбураных тканак, пухлін, наростаў і разрываў тварам у твар сутыкаешся з магутным драпежнікам — смерцю — і пачынаеш змаганне, у якім няма аніякай зброі, акрамя тонка-